УДК 378 (476)

# АСАБЛІВАСЦІ РЭФАРМАВАННЯ СІСТЭМЫ АДУКАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ ВА ЎМОВАХ ДАЛУЧЭННЯ ДА БАЛОНСКАГА ПРАЦЭСУ

**Босак В.М.[1], Босак А.А.[2]**
[1]УА «Беларускі дзяржаўны тэхналагічны ўніверсітэт»,
[2]УА «Беларускі дзяржаўны эканамічны ўніверсітэт»
г. Мінск, Рэспубліка Беларусь

Балонскі працэс афіцыйна аформлены ў 1999 г. падпісаннем Балонскай дэкларацыі, аднак еўраінтэграцыя вышэйшай школы пачала актыўна ажыццяўляцца яшчэ з сярэдзіны 70-х гадоў XX стагоддзя, калі была прынята рэзалюцыя аб першай еўрапейскай праграме супрацоўніцтва ў галіне адукацыі.

На дадзены момант да Балонскага працэсу далучылася 47 краін, у тым ліку ўсе суседзі Рэспублікі Беларусь, якая знаходзіцца некалькі ў баку ад агульных інтэграцыйных тэндэнцый у галіне адукацыі.

Патрэбна адзначыць, што Рэспубліка Беларусь дэ-факта прызнала асноўныя прынцыпы Балонскага працэсу: у краіне ўведзена шматузроўневая сістэма вышэйшай адукацыі (спецыяліст – магістр – аспірант), шэраг вышэйшых навучальных устаноў атрымаў статус навуковых, робяцца пэўныя высілкі па інтэрнацыяналізацыі вышэйшай школы, студэнцкаму абмену і г.д.

Разам з тым дэталёвага прагназавання шляхоў развіцця вышэйшай школы ў Рэспубліцы Беларусь на перспектыву (20–50 гадоў), у тым ліку і ў галіне еўраінтэграцыі, няма.

Да сярэдзіны XX ст. вышэйшая адукацыя была дастаткова элітарнай. Потым надышоў перыяд "масавай" вышэйшай адукацыі, што ў многім і передумовіла ўвядзенне двухузроўневай ступені ў вышэйшай школе. На ступені "бакалаўра" займаюцца ўсе жадаючыя, якія маюць адпаведныя стасункі ў галіне школьнай адукацыі. Выпускнікі бакалаўрыяту працуюць, як правіла, на малодшым і сярэднім узроўні, у тым ліку і ў якасці кваліфікаваных рабочых (у той жа Японіі практычна ўсе высокакваліфікаваныя рабочыя маюць вышэйшую адукацыю). Працягваюць падрыхтоўку ў магістратуры найбольш тэленавітыя (у Еўропе гэта каля 15% студэнтаў). Магістранты ў будучым займаюць вядучыя пазіцыі ў народнай гаспадарцы, а таксама ў навуцы і вышэйшай школе.

У 55 вышэйшых навучальных установах Рэспублікі Беларусь на дадзены момант займаецца свыш 445 тыс. студэнтаў, што болей чым у два разы перавышае іх колькасць на 1990/1991 гг. (188,5 тыс.) і ў 20 разоў – на 1940/1941 гг. (21,5 тыс.).

Па ліку студэнтаў на 10 тыс. жыхароў Рэспубліка Беларусь апярэджвае большасць развітых краін, аднак якасць адукацыі не заўсёды адпавядае неабходным патрабаванням.

Пры гэтым толькі ў Мінску налічваецца 31 вышэйшая навучальная ўстанова і болей 200 тыс. студэнтаў, чаго няма ні ў адной заходнееўрапейскай сталіцы. Да вышэйшых навучальных устаноў Мінска патрэбна дабавіць сярэднія спецыяльныя і прафесійна-тэхнічныя ўстановы адукацыі,



РЕПОЗИТОРИЙ ГГАУ

разнастайныя інстытуты перападрыхтоўкі і павышэння кваліфікаці і г.д., якія павялічваюць колькасць мінскіх стэдэнтаў яшчэ амаль на 100 тысяч.

Між тым у Рэспубліцы Беларусь няма неабходнасці ні ў такой колькасці студэнтаў, ні ў такой колькасці дзяржаўных навучальных устаноў, тым больш іх звышканцэнтрацыі ў сталіцы. Навучальныя ўстановы ў многіх выпадках проста дубліруюць адзін аднаго, ствараюць транспартныя праблемы, праблемы з інтэрнатамі і г.д. Тым больш, што колькасць выпускнікоў сярэдніх школ скарачаецца (у 2015 годзе прагназуецца блізу 55 тыс. выпускнікоў школ, у тым ліку ў Мінску – 25 тыс.).

У Мінску дастаткова мець некалькі грамадзянскіх дзяржаўных навучальных устаноў: адзін класічны ўніверсітэт, тэхнічны ўніверсітэт, медыцынскі ўніверсітэт, эканамічны ўніверсітэт, а таксама ўніверсітэты культуры і фізічнай культуры пры агульнай колькасці студэнтаў не болей за 100 тыс. (у цэлым па краіне – 200–250 тыс. студэнтаў). Адначасова патрэбна ўзмацніць рэгіянальныя вышэйшыя навучальныя ўстановы, шэраг з якіх таксама магчыма аб'яднаць.

Напрыклад, на Беларусі няма неабходнасці ў 4 вышэйшых навучальных установах аграрнага профілю, а таксама ў падрыхтоўцы спецыялістаў-аграрнікаў у няпрофільных вышэйшых навучальных установах. Віцебскую дзяржаўную акадэмію ветэрынарнай медыцыны мэтазгодна аб'яднаць з Беларускай дзяржаўнай сельскагаспадарчай акадэміяй, Беларускі дзяржаўны аграрны тэхнічны ўніверсітэт – з Гродзенскім дзяржаўным аграрным універсітэтам шляхам стварэння ў Горках і Гродна адпаведных факультэтаў.

Неабходны таксама ўзважаныя прапановы па аб'яднанню вышэйшых навучальных устаноў і ў другіх гарадах Беларусі (2 тэхнічных універсітэты ў Гомелі, дубліраванне факультэтаў і г.д.).

Наспела пытанне і аб ведамасных вышэйшых навучальных установах – усе грамадзянскія ВНУ мэтазгодна вывесці з ведамаснай падпарадкаванасці: адпаведныя міністэрствы і ўстановы робяць заказ на падрыхтоўку спецыялістаў праз Міністэрства адукацыі, на навуковыя распрацоўкі на конкурснай падставе і г.д.

УДК 378.14:61

## НЕКОТОРЫЕ АСПЕКТЫ ПОВЫШЕНИЯ КАЧЕСТВА ВЫСШЕГО МЕДИЦИНСКОГО ОБРАЗОВАНИЯ И ИНТЕГРАЦИИ В БОЛОНСКИЙ ПРОЦЕСС

**Гольцев М.В., Гольцева М.В.**
УО «Белорусский государственный медицинский университет»
г. Минск, Республика Беларусь

Преобразования в европейской системе высшего образования в рамках Болонской декларации основываются на общности фундаментальных принципов высшего образования. Политические реальности нахождения в Таможенном Союзе и Союзном государстве Беларуси и России с учетом того, что Российская Федерация присоединилась к Болонскому процессу в сентябре 2003 году на Берлинской конференции, обязавшись до 2010 года применить



РЕПОЗИТОРИЙ ГГАУ